УДК 796.011:796.332.316.7

***Уладзімер Паўлавіч Люкевіч***
*канд. філас. навук, дац., дац. каф. спартыўных дысцыплін і методык іх выкладання*
*Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна*
***Uladzimier Lukievic***
*Candidate of Philosophical Sciences, Associate Professor,*
*Associate Professor of the Department of Sports Disciplines and Methods of Their Teaching*
*of the Brest State A. S. Pushkin University*
e-mail: lucul@brsu.brest.by

# ФУТБОЛ ЯК САЦЫЯКУЛЬТУРНЫ ФЕНОМЕН: ФІЛАСОФСКІ І САЦЫЯЛАГІЧНЫ АСПЕКТЫ

*Футбол у сучасным свеце з'яўляецца самым распаўсюджаным і папулярным відам спорту. У яго міжнародныя арганізацыйныя структуры ўваходзяць больш краінаў, чым у ААН. Аднак толькі ў апошняй трэці XX ст. футбол як сацыякультурны феномен усур'ёз зацікавіў прадстаўнікоў філасофіі і шэрагу гуманітарных навук. У прадстаўленым матэрыяле аналізуюцца актуальныя праблемы футбола, выяўляюцца яго сувязі з іншымі сферамі чалавечага жыцця, разглядаюцца філасофскія канцэпцыі, што апісваюць дынаміку развіцця футбола ў часе і прасторы.*

***Ключавыя словы:*** *філасофія, спорт, футбол, культура, гульня, забава, прафесіяналізацыя, глабалізацыя.*

## *Football as a Sociocultural Phenomenon: Philosophical and Sociological Aspects*

*Football in the modern world is the most common and popular sport. Its international organizational structures include more countries than the UN. However, it was only in the last third of the 20th century that football as a sociocultural phenomenon seriously interested representatives of philosophy and a number of humanities. The presented material analyzes the actual problems of this type of human activity, reveals its connections with other spheres of society, considers philosophical concepts that describe the dynamics of football development in time and space.*

***Key words:*** *philosophy, sport, football, culture, game, entertainment, professionalization, globalization.*

Гуляць у футбол вельмі проста, але гуляць у просты футбол – самае складанае
*Йохан Кройф, нідэрландскі футбаліст і трэнер,*
*трохразовы ўладальнік Залатога мяча лепшага футбаліста Еўропы*

Я думаю, таму я гуляю
*Андрэа Пірла, італьянскі футбаліст і трэнер,*
*адзін з лепшых паўабаронцаў у гісторыі італьянскага футболу*

## Уводзіны

Філасофскае асэнсаванне футболу патрабуе найперш звярнуцца да гістарычных вытокаў гэтай самай папулярнай гульні на свеце. Кароткі пералік найбольш агульнай інфармацыі пра гэты від спорта з шэрагу самых разнастайных крыніц зводзіцца да таго, што ўжо ў 1280 г. у Англіі з'явілася апісанне спаборніцтва, у якім выкарыстоўваліся ногі. З 1409 г. пачынае ўжывацца паняцце футбол. Нарэшце, у 1863 г. была створана першая на свеце футбольная арганізацыя. Традыцыйна лічыцца, што менавіта Брытанія стала радзімай гульні ў футбол. Разам з тым падчас Міжнароднай футбольнай выставы 15 ліпеня 2004 г. у Пекіне FIFA прызнала сапраўднасць знаходак у гэтай краіне, датаваных 300 г. да н. э., і ў сувязі з гэтым менавіта Кітай быў абвешчаны радзімай футболу.

Па вялікім рахунку гульні з мячом былі ўласцівыя шмат якім старажытным культурам. Справа толькі ў тым, наколькі яны могуць быць верыфікаванымі ў адпаведных артэфактах, каб можна было меркаваць аб іх дачыненні непасрэдна да футболу. Дакладна, напрыклад, вядома пра фларэнтыйскае кальча з XIV ст. Сцвярджаецца, што брытанцы, калі пабачылі гэты від спорту, то захапіліся ім і сталі праводзіць падобныя спаборніцтвы ў сябе на радзіме.

Але арганізацыйна сістэматызаваны футбол як від спорту з акрэсленымі правіламі пачынае развівацца ў Англіі XIX ст.

Колькасць гульцоў у камандзе, праўда, вагалася ад 11 да 14, але матчы праводзіліся ўжо на абмежаванай плошчы даўжынёй каля 70–90 метраў з брамамі. Затым у 1846 г. распрацоўваецца першасны варыянт правілаў, які праз два гады ўдакладняецца, пасля чаго з невялікімі змяненнямі ён робіцца падставай для Англійскай футбольнай асацыяцыі. Пазней, у 1857 г., быў створаны першы ў свеце футбольны клуб «Шэфілд» з горада Дронфілд. Гэтая падзея афіцыйна была прызнана FIFA. Нарэшце, у 1873 г. 11 англійскіх клубаў заснавалі Футбольную асацыяцыю. А праз дзесяць гадоў адбыўся першы міжнародны матч паміж Англіяй і Шатландыяй, які не выявіў пераможцаў. У 1904 г. была створана галоўнай сусветнай футбольнай арганізацыі – FIFA, якая кіруе гэтай гульнёй на міжнародным узроўні. Першым прэзідэнтам быў абраны Рабэр Герэн, французскі журналіст, які займаў дадзеную пасаду з 1904 па 1906 г.

Папулярнасць гэтага віду спорта падмацоўваецца красамоўнымі лічбамі. Па шэрагу дадзеных агульная колькасць гульцоў на пачатку XXI ст. на свеце складала каля 265 млн, што адпавядае прыкладна 4 % насельніцтва планеты, а заўзятарамі гэтай гульні лічылі сябе каля 3,5 млрд людзей – мужчын і жанчын разам. Такая інфармацыя пацверджаная вынікамі апытання FIFA Big Count. На яго дадзеныя спасылаецца Крысціана Айзэнберг, *якая звяртае ўвагу на сам працэс станаўлення феномена футбола як сацыяльнай з'явы, калі на пачатку англійскай індустрыялізацыі паўсталі адпаведныя варункі, якія спрыялі развіццю культурнага патэнцыялу гэтага віду спорта: яна робіць акцэнт на значным павелічэнні зарабатнай платы для рабочых, ролі прафсаюзаў у праве на вольны час у другую палову дня па суботах, новых камунікацыйных магчымасцях і інш.* [1, с. 91, 93, 94]. На канец 2022 г. у склад FIFA уваходзіла 211 краін пры членстве 193 дзяржаў у ААН [4; 7]. Можна таксама пагадзіцца з высновамі Антаніны Класкоўскай, якая разглядае спорт у якасці феномена масавай культуры і падкрэслівае той факт, што большасць насельніцтва планеты звязана з ім у той ці іншай форме. Гэта меркаванне з'яўляецца дастатковым, каб абвясціць гэтую грамадскую з'яву прадметам тэарэтычных разважанняў і даследаваць яе практычную ролю [19].

Філасофія футбола, як, дарэчы, і філасофія спорту, мае даволі кароткую гісторыю. Перш за ўсё гэта звязваецца з тым, што класічная навука не надавала належнай увагі феномену гульні. З вялікай нацяжкай пры жаданні можна знайсці нейкія аддаленыя фрагменты, што маюць да яе нейкія апасродкаваныя адносіны. Але бадай толькі Ёхан Хейзінга па-сапраўднаму паспрабаваў акрэсліць само паняцце «гульня» скрозь прызму шэрагу відаў чалавечай дзейнасці. Між тым, калі размова ідзе пра сацыяльныя з'явы, якія маюць дачыненне да сотняў мільёнаў людзей, то яны з неабходнасцю патрабуюць свайго навукова-тэарэтычнага асэнсавання. Філасофія футболу па вялікім рахунку з'яўляецца неад'емнай часткай філасофіі спорту, і таму падставовыя аспекты яе праблемнага поля спалучаюцца з тымі актуальнасцямі, якія існуюць не толькі ў самой сістэме спорту, але і ў грамадстве ў цэлым. Сусветна вядомы французскі філосаф-экзістэнцыяліст, лаўрэат Нобелеўскай прэміі ў галіне літаратуры 1957 г. Альбер Камю выказаўся на гэты конт наступным чынам: «Таму, што я зрэшты найбольш дакладна ведаю пра мараль і абавязкі людзей, я абавязаны спорту» [20, p. 352].

70-е гг. XX ст. можна з поўным правам акрэсліць, як пачатак зацікаўленасці спортам у якасці аб'екта навуковых даследаванняў з боку філасофіі. Таму што нельга не браць пад увагу такі сацыяльны феномен, які знаходзіцца ў сферы інтарэсаў сотняў мільёнаў людзей. Спорт даўно патрабаваў свайго ўласнага філасофскага асэнсавання, тым больш што ён ахопліваў практычна ўсе ўзроставыя групы насельніцтва незалежна ад гендэрнага падзелу, сацыяльнага і матэрыяльнага стану, культурна-рэлігійнага веравызнання і г. д. Спорт за кароткі час прыцягнуў да сябе ўвагу даследчыкаў з розных галінаў навукі. Зразумела, што філасофія не магла застацца збоку ад тых працэсаў, якія адбываліся ў гэтай сферы. Вылучэнне прафесійнага, камерцыйнага, аматарскага спорту, а таксама спорту для ўсіх прымусіла больш дакладна звярнуцца да тэорыі і практыкі дадзенага віду дзейнасці. Асаблівую цікавасць у сучасны момант выклікаюць праблемы маральнага зместу.

Як слушна заўважае Вільям Морган, філасофія спорту адносна нядаўна стала

аб'ектам зацікаўленасці навукоўцаў. Гэта здарылася недзе ў шасцідзясятыя гады мінулага стагоддзя, на што паўплывалі дзве наступныя падзеі: па-першае, даследаванні спорту, якія маюць сувязі са старой галіной фізічнага выхавання на базе медыцыны і педагогікі, але з новымі дадаткамі сучасных даследаванняў у філасофіі, гісторыі і сацыялогіі; па-другое, запозненьі разгляд спорту менавіта філасофіяй, якая праз доўгі час не цікавілася гэтай з'явай [3, с. 147–148]. Даць азначэнне філасофіі спорту, працягвае ён, выявілася досыць складанай справай. Галоўныя спрэчкі ў метафізічным вывучэнні спорту згрупаваліся ў трох наступных галінах. Першая была звязана са своеасаблівым канцэптуальным аналізам, які выкарыстоўвалі метафізікі, каб выпрацаваць адпаведную дэфініцыю. Другая – вызначэнне ў канцэптуальным аналізе спорту сувязі адпаведных культурных практык у фармальных тэрмінах. І, нарэшце, трэцяя – пытанне асаблівасцяў тлумачэння спорту, а менавіта асаблівых адносінаў паміж спортам і гульнямі праз дэфініцыі [3, с. 150–152].

Калі больш дакладна акрэсліць магчымыя накірункі даследаванняў у галіне спорту, то не можа застацца па-за ўвагай пытанне аб ягонай прыродзе, і чаму, напрыклад, маленькія дзеці так захапляюцца гульнёй, а ў адказ на банальнае пытанне да дзіцяці «а што ты робіш?» гучыць не менш банальнае «я гуляю». Форма і змест спорту не застаюцца раз і назаўсёды дадзенымі. Ужо зараз вядуцца дыскусіі адносна таго, наколькі правамерна да феномена традыцыйнага спорту («in-real-sport») далучаць кіберспорт (eSport) [9]. Гэта як, напрыклад, супаставіць класічную версію футбола 11 × 11 з электронным варыянтам FIFA 22.

Кароткі пералік філасофскай тэматыкі ў спорце (і футбол не выключэнне) пераважна палягае на вывучэнні этычнай праблематыкі, у тым ліку такіх аспектаў, як небяспека і брутальнасць, допінгавае злоўжыванне, карупцыя, махлярства, гендэрная няроўнасць, расізм, сацыяльная, культурная і матэрыяльная дыферэнцыяцыя, інваспорт.

Футбол як гульня характарызуецца жорсткай кантактнай барацьбой, якая часам нясе пагрозу для здароўя. Траўматызм у такім выпадку з'яўляецца звычайнай справай. Аднак тут неабходна размяжоўваць шэраг спецыфічных аспектаў, якія, напрыклад, звязваюцца з парушэннем правілаў спаборніцтваў і прыводзяць да наўмыснай брутальнасці з мэтай атрымаць перавагу як у канкрэтным эпізодзе, так і канчатковую перамогу.

Пашыраныя ўводзіны да вызначанай тэматыкі адносна гістарычнай яе часткі і шэрагу іншых аспектаў тлумачацца тым, што дадзеная праблематыка плануецца да далейшага разгляду ў некалькіх наступных публікацыях, дзе будуць аналізавацца актуальныя пытанні сучаснага футболу.

*Мэта артыкула* заключаецца ў філасофскім абгрунтаванні феномену футбола як сацыякультурнай з'явы і неад'емнага атрыбуту спорта ў сукупнасці адносінаў да практыкі спаборніцтваў і запытаў публічнасці. Аб'ектам вывучэння выступае гульня як з'ява грамадскага жыцця і сфера забаўляльнай галіны. Сярод галоўных задач вылучаюцца такія, як акрэсленне сутнасці футболу, выяўленне яго характэрных і спецыфічных рысаў, аналіз і асэнсаванне маральна-этычнай і эстэтычнай праблематыкі, небяспекі і брутальнасці, допінгавага стымулявання, карупцыі, махлярства, інваспорту, міграцыі і інш.

У працэсе падрыхтоўкі дадзенай публікацыі выкарыстоўваліся такія *метады даследавання*, як назіранне на падставе суб'ектыўнага шматгадовага ўспрымання аўтарам футбольных матчаў, апісанне, параўнанне, аналіз навуковых і дакументальных крыніц, а таксама вывучэнне інтэрнэт-інфармацыі. Філасофскі аналіз футбола як сацыякультурнай з'явы таксама патрабуе ўсебаковага разгляду розных фактараў, якія спадарожнічаюць яго функцыянаванню, развіццю і пашырэнню ў часе і прасторы.

**Вынікі і абмеркаванне**

Надзвычайную папулярнасць футболу ў грамадстве нельга растлумачыць адзіна толькі патрэбай гульні, што іманентна ўласцівая кожнай чалавечай асобе. Названы від спорту арганічна спалучыў у сабе шэраг дамінантных характарыстык, якія надаюць індывідууму якасна іншае аблічча, утвараюць яго другое «я», фармуюць спецыфічную сістэму адносінаў паміж людзьмі. У сістэму футбольнай дзейнасці ўключаюцца розныя суб'екты, часам нават незалежна ад таго, наколькі яны маюць уласнае жаданне да гэтага. Футбол як сацыякультурная з'ява да-

мінуе сярод іншых відаў спорту, а ў сучасным свеце выступае як адзін з моцных фактараў гаспадарчага і палітычнага жыцця.

Футбольнае майстэрства непасрэдна можа разглядацца ў якасці важнейшай спартыўнай годнасці. Сэнс успрымання такой сентэнцыі непарыўна спалучаецца з сацыякультурным складальнікам чалавечай жыццёвай дзейнасці і па-за межамі спаборніцтваў. Як пазначае Эндру Сабл, футбаліст топавай каманды з'яўляецца не проста прадстаўніком галіны вобласці спорту, ён фармуе ў культурным атачэнні сацыяльна значны імідж, які ўплывае на шматмільённае кола заўзятараў [11]. Футбол у дадзеным кантэксце выяўляецца не проста забаўляльным шоў, ён стварае своеасаблівую іерархію каштоўнасцяў, якая мае непасрэднае дычыненне да асобы, напрыклад, культ Дыега Марадоны, што ў выніку прывяло да ўзнікнення так званай Iglesia Maradoniana, ці плыні аргенцінскай парадыйнай рэлігіі, якая была заснавана ў 1998 г. групай фанатаў гэтага легендарнага футбаліста. Адэптамі яе руху з'яўляюцца больш за 150 тыс. чалавек на ўсім свеце.

Змест спартыўнага спаборніцтва характарызуецца сваёй неадназначнасцю і непрадказальнасцю. Аднак сучасны футбол нярэдка дэманструе негатыўныя бакі свайго функцыянавання, якія датычацца махлярства. Разуменне махлярства ў сэнсе падману можа інтэрпрэтавацца як наўмыснае парушэнне правілаў для атрымання канкурэнтнай перавагі [5; 10]. Падобнае можа адбывацца непасрэдна пад час правядзення канкрэтнага матчу. Футбольныя арбітры, каб прадухіліць такога кшталту з'явы, выносяць парушальнікам папярэджанні альбо ўвогуле выдаляюць з поля. Тым не менш паняцце «тактычнага фолу» трывала ўвайшло ў практыку спаборніцтваў і наўмыснае парушэнне правілаў гульні трактуецца зараз як адзін з неад'емных атрыбутаў суперніцтва. Існуюць розныя спосабы ўплыву на вынік спаборніцтваў. Адзін з іх палягае на ціску з боку рэферы матча, калі той літаральна «саджае гульню на свісткі», г. зн. фіксуе практычна ўсе парушэнні для адной з камандаў. Праўда, адрозніць выпадкі сімуляцыі бывае даволі складана. Яшчэ больш складана, калі маніпуляцыя вынікамі футбольных гульняў адбываецца апасродавана на падставе ставак у букмекерскіх канторах. Застаецца, бадай, галоўная праблема: ці магчыма выправіць сітуацыю для пакрыўджанага боку пасля заканчэння футбольнага матчу, які завершыўся з прыкметамі махлярства.

Футбол як від спорта імкліва развіваецца. Гэта можна заўважыць па шмат якіх паказальніках. Футбольная інфраструктура ўяўляе сабой збалансаваную сістэму для задавальнення самых разнастайных патрэбаў прыхільнікаў гэтага віду спорту. Сучасныя стадыёны, буйнейшыя з якіх маюць магчымасці размясціць сто тысяч гледачоў і нават больш, падаюцца вяршынямі дасягненняў мастацка-архітэктурнай і тэхніка-тэхналагічнай думкі. Высокімі тэмпамі ўдасканальваюцца тэарэтычныя, метадычныя і медыцынскія напрацоўкі, якія датычацца сістэмы трэнінгаў і спаборніцтваў. Дзеля павелічэння эфектыўнасці сваёй дзейнасці спартоўцы выкарыстоўваюць найноўшыя распрацоўкі як фармакалагічных рэчываў, так і сучасныя інвентар і экіпіроўку. Метады паляпшэння як гульнявой, так і па-за гульнявой дзейнасці бесперапынна пашыраюць свой уплыў на самыя розныя катэгорыі насельніцтва. Філасофія спорту (і футболу ў тым ліку) задаецца пытаннем адносна таго, ці маюцца нейкія межы, якія можна лічыць максімальна высокімі, ці іх вызначэнне і дасягненне практычна невыканальна. Гэта датычыцца перспектывы развіцця як самога гульца, так і адносінаў да спорту з боку шырокіх колаў публічнасці. Ужо зараз падаюцца праблемнымі маніпуляцыі са сваім асабістым целам і здароўем у выніку злоўжывання забароненымі сродкамі і рэчывамі дзеля паспяховага выступлення на спаборніцтвах. Наколькі грамадства ў цэлым здольнае прымаць перамогу за ўсялякі кошт, і ці ўвогуле існуе нейкі ўніверсальны, – апрача, зразумела, каштоўнасці чалавечага жыцця, – крытэрый, які можа быць прызнаны ў якасці ўсеагульнай меры ў халістычным яе ўспрыманні.

Футбол як дынамічны, кантактны камандны від спорту іманентна ўтрымлівае ў сабе пагрозу для ўласнага здароўя гульцоў, прычым неабходна заўважыць, што на небяспеку атрымання пашкоджання ўплываюць разнастайныя фактары: ад варункаў надвор'я да наўмыснага брутальнага фолу з боку суперніка. Апошняе з'яўляецца найбольш складаным у філасофска-этычным

плане пры аналізаванні той ці іншай гульнявой сітуацыі. Ці сапраўды брутальнае парушэнне правілаў было наўмысным, ці гэта быў толькі нешчаслівы выпадак?.. Наколькі матывацыя паўплывала на тое або іншае парушэнне правілаў?.. Як павінна выглядаць сатысфакцыя ў адказ?.. Якія пабочныя фактары павінны ўлічвацца ў выніку гульні «no fair»?..

Футбол традыцыйна падзяляецца на некалькі ўзроўняў адносна шэрагу вызначальных крытэрыяў. Напрыклад, дзіцячы, юнацкі, юніёрскі, дарослы, ветэранскі, прафесійны, аматарскі і інш. Філасофію футбола між тым цікавяць пытанні, якія адносяцца да гендэрнай праблематыкі. На ўвазе маецца гульня, у якой удзельнічаюць жанчыны. Зразумела, што тэндэнцыі эмансіпацыі ў варунках глабалізацыйнага грамадства нельга перапыніць, тым не менш жаночы футбол, ці футбол як гульня ў выкананні жанчынаў, правацыруе на дыскусію адносна дыялектычнага суіснавання ў межах больш шырокай сэнсавай парадыгмы «мужчына – жанчына». Альбо наколькі адпавядае маральнаму і эстэтычнаму ідэалу ў традыцыйным разуменні вобраз мужчыны ў футболе і, адпаведна, вобраз жанчыны ў гэтым жа відзе спорту. Можна з пэўнай доляй рэальнасці ўявіць сабе мокрага потнага футбаліста ў перапэцканай брудам спартыўнай форме з перакошаным ад напругі тварам пад час гульні ў футбол і захапляцца прыгажосцю спорта. Але калі ягонае места займае жанчына, ці можна адназначна сцвярджаць, што гэта таксама прыгожа. Ну і, зразумела, зусім цяжка ўявіць сабе змешаныя жанoctа-мужчынскія футбольныя каманды на прафесійным узроўні. Хоць у іншых гульнях, напрыклад, у тэнісе падобнае дапускаецца. І яшчэ адна далікатная этычная праблема, якая датычыцца ўдзелу ў футболе трансгендэраў і інтэрсэкс-спартоўцаў. У 1920-я гг. шырока распаўсюдзіўся рух «coming out», які акрэсліваецца як працэс адкрытага і добраахвотнага прызнання сваёй прыналежнасці да сексуальнай альбо гендэрнай меншасці ці як вынік такога працэсу. Гэты тэрмін мае адносіны пераважна да лесбіянак, геяў, бісэксуалаў і трансгендэраў. Публічныя сродкі масавай інфармацыі ўсё часцей фіксуюць выпадкі падобнага тыпу ў футболе, і асабліва ў жаночым. Сярод іншых называюцца імёны даволі вядомых прадстаўніц нацыянальных зборных сваіх краін, такіх, як Надзін Ангерэр, Штэфані Джонс, Урсула Холл з Германіі, Мэган Рапіна з ЗША. Згодна з дадзенымі, агучанымі ў спецыяльным фільме UEFA, што быў прысвечаны даследаванню праблемы дыскрымінацыі ў сусветным футболе і яе сувязі з сэксуальнай арыентацыяй, сацыяльным статусам, этнічнай, палавой і рэлігійнай прыналежнасцю, прыводзяцца дадзеныя з жаночага Чэмпіянату свету па футболе 2019 г., калі больш за 40 удзельніцаў першынства адкрыта абвяшчаюць пра сваю нетрадыцыйную сэксуальную арыентацыю [2]. Сучаснае глабалізаванае грамадства ў яго выглядзе «invariants of an open society» грунтуецца на падставах некласічнай філасофіі, што стварае магчымасці талерантнага ўспрымання сацыяльнай рэчаіснасці. Футбол у дадзеным выпадку менавіта гэта і дэманструе.

Працэсы дэмакратызацыі, лібералізацыі, гуманізацыі, эмансіпацыі, міграцыі і характарызуюць функцыянаванне і развіццё сучаснай цывілізацыі. Спорт як своеасаблівае люстэрка дэманструе як станоўчыя, так і негатыўныя іх бакі. Сацыяльная напруга ў грамадстве мае свой працяг у футболе. Па сённяшні дзень абвострана ўспрымаецца на розных узроўнях супрацьстаянне паводле крытэрыя расавай дыферэнцыяцыі. Сусветны футбол падтрымаў-грамадскі рух Black Lives Matter (жыццё чорных важнае), які накіраваны супраць расізму і гвалту ў адносінах да чарнаскурых, у асаблівасці супраць паліцэйскага гвалту. У футболе гэта выяўляецца ў выразе добраахвотнай акцыі перад пачаткам матчаў сярод гульцоў, трэнераў і арбітраў у падтрымку барацьбы за грамадзянскія правы цёмнаскурых праз такі знак салідарнасці, як укленчанне. Іншымі словамі футбалісты апускаюцца на адно калена, і гэты выраз дэманструе іх стаўленне да праблемы. Праўда, неабходна заўважыць, што апошнім часам далёка не ўсе каманды прытрымліваюцца гэтага рытуалу.

Філасофія футболу з неабходнасцю павінна ўлічваць той факт, што зацікаўленасць да гэтай гульні праяўляюць сотні мільёнаў людзей. Сярод іх вызначаецца найбольш актыўная частка, якая можа быць акрэслена як заўзятары, а самыя радыкальныя з іх называюцца футбольнымі фанатамі. Зразумела, што футбол у залежнасці ад прыярытэтаў гледачоў можа выклікаць са-

мыя разнастайныя эмоцыі, якія ў рэчаіснасці могуць акрэсліваяцца як супрацьлеглыя. Практычна ў кожнай краіне з еўрапейскіх топ-чэмпіянатаў вызначаюцца актыўныя моладзевыя групоўкі: «fans» (Англія), «inchas» (Іспанія), «*tifosi»* (Італія) і г. д. Такі самы рух назіраецца і на іншых кантынентах. Часам арганізацыйна сфармаваныя структуры праводзяць разнастайныя акцыі ў фармаце экшн, але разам з тым даволі часта прыхільнікі розных футбольных клубаў удзельнічаюць у адкрытай канфрантацыі паміж сабой у выглядзе непасрэдных боек. Як заўважае Эндру Ходжэс з Універсітэту Нові Сад у Сербіі, неабходна прымаць пад увагу адрозненні ў характарыстыках груповак, у дадзеным выпадку паміж «футбольнымі хуліганамі» і «ўльтрас». Першыя маюць асацыяцыі з асобамі агрэсіўных паводзінаў, што пазней стала выяўляцца ў іх сувязях з расізмам і дэструктыўнай дзейнасцю [6, p. 3], другія канцэнтруюць сваю актыўнасць на тым, каб выказаць маляўнічую падтрымку для сваёй каманды ў розных формах [6, p. 3–4]. Праўда, апошнім часам такі падзел становіцца ўсё больш складаным. Так, у 2016 годзе да дзесяці найбольш небяспечных футбольных груповак на свеце адносіліся тыя, што мелі дачыненне да наступных клубаў: UltrAslan – Galatasaray (Стамбул, Турцыя), Irriducibles – Lazio (Рым, Італія), Delije – Red Star (Белград, Сербія), Millwall Bushwackers – Millwall (Лондан, Англія), Los Borrachos del Tablon – River Plate (Буэнас-Айрэс, Аргенціна), Trinchera Norte – Universitario Lima (Ліма, Перу), Ultras – Metalist Kharkiv (Харкаў, Украіна), Green Monsters – Ferencvaros (Будапешт, Венгрыя), Boixos Nois – FC Barcelona (Барселона, Іспанія), Ultras Sur – Real Madrid C.F. (Мадрыд, Іспанія) [18].

Праз пяць гадоў класіфікацыя падверглася зменам, і па выніках 2021 г. Ranking Ultras World 2021: прыняў наступны выгляд: 1. Legia Warsaw Ultras (Польшча); 2. Red Star Ultras Belgrade (Сербія); 3. Zenit St Petersburg Ultras (Расія); 4. Olympique Marseille Ultras (Францыя); 5. Brondby IF Brondby Ultras (Данія); 6. Djurgardens IF Stockholm Ultras (Швецыя); 7. FC Copenhagen Ultras (Данія); 8. Slavia Prague Ultras (Чэхія); 9. Ferencvaros Budapest Ultras (Венгрыя); 10. Ruch Chorzow Ultras (Польшча) [15; 17].

Іншым разам паняцце «ўльтрас» характарызуецца як групоўка экстрэмальных фанатаў, якія з'яўляюцца шалёнымі прыхільнікамі сваіх камандаў. Падчас матчаў на стадыёне яны выкарыстоўваюць фаеры, галасавую падтрымку, дэманструюць банэры рознага зместу для стварэння адметнай атмасферы на спартыўным аб'екце, каб захвоціць свой клуб да перамогі і адначасова зрабіць псіхалагічны ціск на суперніка і ягоных заўзятараў. Ультрас, як правіла, у сваёй дзейнасці базуюцца на вызначанай ідэалогіі і прытрымліваюцца пэўных палітычных поглядаў. Напрыклад, кіраўніцтва варшаўскай «Легіі» неаднаразова падвяргалася разнастайным санкцыям ад нацыянальнай і еўрапейскай федэрацыяў футболу за паводзіны сваіх заўзятараў з-за іх расісцкай, шавіністычнай і нацыяналістычнай пазіцыі.

Філасофія футболу застаецца безраднай у шмат якіх выпадках у спробе інтэрпрэтацыі дэвіянтных паводзінаў ультрас. Падчас матчу кваліфікацыі Лігі Еўропы 2015 г. ультрас «Легіі» на перапоўненым стадыёне ў Варшаве спявалі дзве прыпеўкі ў звароце да супернікаў з румынскага клуба ФК «Баташаны»: «Choćbyś się umył, spryskał perfumem, jesteś Rumunem, jesteś Rumunem!» («Хоць бы памыўся, папрыскаў парфумам, застаешся румынам, застаешся румынам!»), а таксама «Botoszany, Botoszany – same kurwy i cygany!» («Баташаны, Баташаны – толькі курвы і цыганы!»). Дырэктар клубу Сявэрын Дмоўскі тлумачыў сітуацыю наступным чынам: «Гэта можна разглядаць так, што калі нехта спявае гэтыя песні, то для таго, што фактычна ненавідзіць румынаў ці цыганаў. Аднак калі паглядзець на гэта ў канкрэтным сацыяльна-культурным кантэксце і праз прызму стадыённага рытуалу, які вельмі падобны на ўсім свеце, то маем папросту дачыненне са спробай дыскрэдытацыі працаўніка. Трэба прызнаць, не вельмі мудрагелістай і даволі прымітыўнай» [8].

**Заключэнне**

Футбольнае відовішча можа разглядацца як спосаб кансалідацыі людзей дзеля задавальнення сваіх патрэбаў у зносінах з іншымі. Гэта надае дадзенаму віду спорта дадатковую вартасць. Непрадказальнасць выніку гульні дазваляе ўзвесці яе ў зусім іншы ранг у параўнанні з другімі відамі чала-

вечай дзейнасці, напрыклад, тэатральным мастацтвам адносна самаго сюжэту. Так, шэкспіраўская класіка «Рамэа і Джульетта» раз і назаўсёды застаецца з загадзя вызначаным фіналам. Пра змястоўнае напаўненне іспанскай футбольнай класікі ў выкананні клубнага супрацьстаяння «Рэал» Мадрыд – ФК «Барселона» застаецца гадаць кожны раз, хоць канчатковыя лічбы на табло стадыёна могуць паўтарацца неаднойчы.

З філасофскага пункту гледжання сучасная версія футболу базуецца на хрысціянскай культуры. Канцэпцыя гульні па вялікім рахунку вызначаецца праз асобу трэнера ці, як зараз больш дакладна гаворыцца, менеджэра, які ўзначальвае цэлую групу спецыялістаў. На сённяшні дзень навука вывучае футбол шмат з якіх бакоў, у тым ліку з біялагічнага, медыцынскага, псіхалагічнага, эканамічнага, маркетынгавага і г. д. І сапраўды было б дзіўным, каб у гэтым ростеры адсутнічала філасофія, якая па сутнасці з'яўляецца маці ўсіх навук і стварае падставы для кіравання кожным відам чалавечай дзейнасці.

Філасофію футболу ў пэўным сэнсе можна разглядаць у часе і прасторы на падставе некалькіх вызначальных падыходаў, а больш дакладна паводле інк'юзіцівістычнай (ад англ. inquisitive – дапытлівы, патрабавальны, занадта зацікаўлены, уключаны ў чужыя справы), нігілістычнай і платанічнай канцэпцый.

Вызначальная роля трэнера, што ствараў, фармаваў і безапеляцыйна кіраваў камандай, палягае на тым, што менавіта ён нясе за яе выступленне ўсю адказнасць. З неабходнасцю такі стыль патрабуе пэўнай моцы характару і цвёрдасці ў прыняцці рашэнняў. На пэўным узроўні футбол набывае хрысціянскае аблічча праз паняцце пакуты. Гэта красамоўна прагучала з вуснаў былога гульца зборнай Аргенціны Хаўера Маскерана: «Я пакутваю праз футбол, мне гэта не падабаецца. Я не з тых, хто забаўляецца, а зусім наадварот. Дзевяноста хвілінаў гульні азначаюць для мяне пакуты. Я павінен заставацца засяроджаным, не рабіць памылак і назіраць за таварышамі па камандзе» [Цыт. па: 12]. Паводле інк'юзіцівістычнай канцэпцыі футболу менавіта ў пакутах чалавек атрымлівае магчымасць адчуваць сябе іншым – супермэнам, які змагаецца і ахвяруе сабой, каб дасягнуць перамогі для сваёй каманды, для сваёй краіны… Ніцшэянскія матывы літаральна пранізваюць падобнае ўспрыманне футболу, асабліва ў тыя моманты, калі адбываецца яднанне самаго гульца і трэнера [12]. Разам з тым топ-футбалісты, як, дарэчы, і футбольныя топ-менеджэры па ўплыве часу набываюць рысы сапраўдных абразоў.

Нігілістычная канцэпцыя футболу ў сваю чаргу заснавана на дэмакратызацыі ведаў, на змяненне адносінаў паміж трэнерам і гульцом. Такая сітуацыя паўстала пад уплывам працэсаў глабалізацыі і камерцыялізацыі (і не толькі!), што таксама адбілася на разуменні самой гульні. Нельга не заўважыць, што змены парадыгмы развіцця спорту ў цэлым закранулі таксама і футбол. Канкрэтызацыяй такой высновы можа стаць характарыстыка пэўнага эпізода гульні, які трактуецца як шлях да перамогі. У дадзеным выпадку, калі каманда атрымала перамогу, то не мае значэння, якім спосабам яна гэтага дасягнула: перамога за ўсялякі кошт пераважае ўсе іншыя варыянты атрымання поспеху. У сучаснасці ў значнай ступені дамінуе той факт, што каштоўнасць матэрыяльных і духоўных рэчаў зводзіцца да іх рынкавага кошту [13].

Платанічная канцэпцыя футболу праз доўгі час захоўвала сваю рамантычную сутнасць. Яе адметнай рысай з'яўляецца тое, што яна прызнае існаванне ісціны, якая ўвасабляецца ў прыгажосці гульні. З аднаго боку, яна не перакрэслівае манаполію на веды, а з другога, гульня трактуецца як пошук прыгажосці, а не перамога за ўсялякі кошт. У эпоху глабалізацыі іерархія матэрыяльных і духоўных каштоўнасцяў падвергласа пераасэнсаванню. У футболе гэта – прыналежнасць заўзятараў да выбранай каманды незалежна ад месца іх лакалізацыі, іншымі словамі адбываецца фармаванне транснацыянальнай супольнасці, а таксама інтэнсіфікацыя працэсу інтэрнацыяналізацыі не толькі на клубным узроўні, але і на ўзроўні зборных камандаў шэрагу краінаў. Хоць сама гульня па-ранейшаму застаецца вызначальнай у гэтым відзе сацыяльнай актыўнасці [14].

Футбол у сістэме адносінаў паміж людзьмі працягвае займаць важнае месца на сусветным узроўні. Як сацыякультурная з'ява ён уплывае на мноства самых разнастайных працэсаў у грамадстве. Тым не

менш з пункту гледжання фенаменалогіі патрабуюць яшчэ далейшага і больш дакладнага асэнсавання такія актуальныя аспекты ягонага функцыянавання, як роля медыяў у футболе, іміджавыя і фінансавыя страты і набыткі, пытанні міграцыі і змены грамадзянства і інш.

Такім чынам, калі зрабіць адпаведныя высновы, то з філасофскага пункту гледжання неабходна падкрэсліць наступнае. Першае, у сістэме глабалізаванага грамадства футбол да гэтага часу працягвае трактавацца паводле хейзінгаўскага «гульнясур'ёзнае», што фрагментарна прысутнічае ў кожным з трох вышэй пазначаных падыходаў. Другое, на падставе некласічнай філасофіі футбол у сучасны перыяд паўстае ў новай якасці, якая ўвасабляецца ў яго татальнай здольнасці інтэграцыі з іншымі сацыяльнымі з'явамі. Трэцяе, згодна з філасофскай рэфлексіяй на падставе суб'ектыўнай перцэпцыі ў футболе за апошнія сто з нечым гадоў адбыліся змены парадыгмальнага развіцця, што сканцэнтраваліся ў дэвізах ад «Галоўнае не перамога, а ўдзел» да «Перамога за ўсялякі кошт». Зразумела, што аўтарскае бачанне акрэсленай праблематыкі не з'яўляецца абсалютнай ісцінай, але, тым не менш шэраг вызначаных аспектаў пакідаюць месца для канструктыўнай палемікі. А апошнюю кропку, як заўсёды, паставіць само жыццё.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

1. Айзенберг, К. Футбол как глобальный феномен. Исторические перспективы / К. Айзенберг // Логос. – 2006. – № 3 (54). – С. 91–103.

2. За гранью фола: проблема дискриминации в футболе [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://euro2020.ria.ru/20201223/film-1590476289.html. – Дата доступа: 15.09.2022.

3. Морган, У. Философия спорта. Исторический и концептуальный обзор и оценка ее будущего / У. Морган // Логос. – 2006. – № 3 (54). – С. 147–159.

4. Allianz and Football [Electronic resource]. – Mode of access: https://www.allianz.com/en/-about-us/sports-culture/football/allianz-football.html#:~:text=Football%20is%20the%20most%20-popular,billion%20consider%20themselves%20football%20fans. – Date of access: 28.06.2022.

5. Green, S. P. Lying, Cheating, and Stealing: A Moral Theory of White-Collar Crime / S. P.Green. – New York : Oxford Univ. Press, 2006. – 240 p.

6. Hodges, A. The hooligan as «internal» other? Football fans, ultras culture and nesting intraorientalisms / A. Hodges // International Review for the Sociology of Sport. – 2014. – P. 1–18.

7. How Many People Play Football in the World? [Electronic resource]. – Mode of access: https://ibaworldtour.com/how-many-people-play-football-in-the-world/. – Date of access: 28.06.2022.

8. Jak Legia Warszawa tłumaczy się z rasizmu, szowinizmu i nacjonalizmu ultrasów? [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://www.newsweek.pl/sport/legia-warszawa-lech-poznan-zamieszki-pseudokibicow-kibice/t24p702. – Дата доступу: 21.09.2022.

9. eSport vs irlSport [Electronic resource] / C. McCutcheon, M. Hitchens, A. Drachen // Advances in Computer Entertainment Technology : 14th International Conference ACE, London, 2017 / M. Inami [et al.] (eds.) – Proceedings. – 2018. – Vol. 10714. – P. 531–542. – Mode of access: https://doi.org/10.1007/978-3-319-76270-8_36. – Date of access: 22.02.2022.

10. Russell, J. S. The Problem of Cheating / J. S. Russell // Philosophy: Sport, Farmington Hills / R. S. Kretchmar (ed.). – Mich : Macmillan Reference USA. – 2017. – P. 93–110.

11. Sabl, A. Democratic Sportsmanship: Contested Games and Political Ethics / A. Sabl // Taiwan Journal of Democracy. – 2008. – № 4 (1). – P. 85–112.

12. Three philosophical conceptions of football: the inquisitive conception [Electronic resource]. – Mode of access: https://barcainnovationhub.com/three-philosophical-conceptions-of-football-the-inquisitive-conception/. – Date of access: 26.09.2022.

13. Three philosophical conceptions of football: the nihilist conception [Electronic resource]. – Mode of access: https://barcainnovationhub.com/three-philosophical-conceptions-of-football-the-nihilist-conception/. – Date of access: 26.09.2022.

14. Three philosophical conceptions of football the platonic conception [Electronic resource]. – Mode of access: https://barcainnovationhub.com/three-philosophical-conceptions-of-football-the-platonic-conception/. – Date of access: 26.09.2022.

15. Top 5 Ultras of 2021 [Electronic resource]. – Mode of access: https://yoursportpress.com/-index.php/2022/01/04/top-5-ultras-of-2021/. – Date of access: 20.09.2022.

16. Top 10 Philosophers in World Football [Electronic resource]. – Mode of access: https://www.thesportster.com/soccer/top-10-philosophers-in-world-football/ – Date of access: 29.09.2022.

17. Top 10 Ultras of 2021 [Electronic resource]. – Mode of access: https://yoursportpress.com/-index.php/2022/01/04/top-10-ultras-of-2021/. – Date of access: 19.09.2022.

18. 10 most dangerous ultras of world football [Electronic resource]. – Mode of access: https://www.sportskeeda.com/football/10-most-dangerous-ultras-world-football. – Date of access: 19.09.2022.

19. Camus, A. What I owe to football / A.Camus. // The footballer's companion ; ed. by B. Glanville. – London : Eyre & Spottiswoode (Publishers) LTD. – P. 350–353.

20. Kłoskowska, A. Kultura masowa. Krytyka i obrona / A. Kłoskowska. – Warszawa : PWN, 2022. – 488 s.

REFERENCES

1. Ajzienberg, K. Futbol kak global'nyj fienomien. Istorichieskije pierspiektivy / K. Ajzienberg // Logos. – 2006. – № 3 (54). – S. 91–103.

2. Za gran'ju fola: probliema diskriminacii v futbolie [Eliektronnyj riesurs]. – Riezhim dostupa: https://euro2020.ria.ru/20201223/film-1590476289.html. – Data dostupa: 15.09.2022.

3. Morgan, U. Filosofija sporta. Istorichieskij i konceptual'nyj obzor i ocenka budushchiego / U. Morgan // Logos. – 2006. – № 3 (54). – S. 147–159.

4. Allianz and Football [Electronic resource]. – Mode of access: https://www.allianz.com/en/-about-us/sports-culture/football/allianz-football.html#:~:text=Football%20is%20the%20most%20-popular,billion%20consider%20themselves%20football%20fans. – Date of access: 28.06.2022.

5. Green, S. P. Lying, Cheating, and Stealing: A Moral Theory of White-Collar Crime / S. P.Green. – New York : Oxford Univ. Press, 2006. – 240 p.

6. Hodges, A. The hooligan as «internal» other? Football fans, ultras culture and nesting intraorientalisms / A. Hodges // International Review for the Sociology of Sport. – 2014. – P. 1–18.

7. How Many People Play Football in the World? [Electronic resource]. – Mode of access: https://ibaworldtour.com/how-many-people-play-football-in-the-world/. – Date of access: 28.06.2022.

8. Jak Legia Warszawa tłumaczy się z rasizmu, szowinizmu i nacjonalizmu ultrasów? [Eliektronny resurs]. – Rezhym dostupu: https://www.newsweek.pl/sport/legia-warszawa-lech-poznan-zamieszki-pseudokibicow-kibice/t24p702. – Data dostupu: 21.09.2022.

9. eSport vs irlSport [Electronic resource] / C. McCutcheon, M. Hitchens, A. Drachen // Advances in Computer Entertainment Technology : 14th International Conference ACE, London, 2017 / M. Inami [et al.] (eds.) – Proceedings. – 2018. – Vol. 10714. – P. 531–542. – Mode of access: https://doi.org/10.1007/978-3-319-76270-8_36. – Date of access: 22.02.2022.

10. Russell, J. S. The Problem of Cheating / J. S. Russell // Philosophy: Sport, Farmington Hills / R. S. Kretchmar (ed.). – Mich : Macmillan Reference USA. – 2017. – P. 93–110.

11. Sabl, A. Democratic Sportsmanship: Contested Games and Political Ethics / A. Sabl // Taiwan Journal of Democracy. – 2008. – № 4 (1). – P. 85–112.

12. Three philosophical conceptions of football: the inquisitive conception [Electronic resource]. – Mode of access: https://barcainnovationhub.com/three-philosophical-conceptions-of-football-the-inquisitive-conception/. – Date of access: 26.09.2022.

13. Three philosophical conceptions of football: the nihilist conception [Electronic resource]. – Mode of access: https://barcainnovationhub.com/three-philosophical-conceptions-of-football-the-nihilist-conception/. – Date of access: 26.09.2022.

14. Three philosophical conceptions of football the platonic conception [Electronic resource]. – Mode of access: https://barcainnovationhub.com/three-philosophical-conceptions-of-football-the-platonic-conception/. – Date of access: 26.09.2022.

15. Top 5 Ultras of 2021 [Electronic resource]. – Mode of access: https://yoursportpress.com/-index.php/2022/01/04/top-5-ultras-of-2021/. – Date of access: 20.09.2022.

16. Top 10 Philosophers in World Football [Electronic resource]. – Mode of access: https://www.thesportster.com/soccer/top-10-philosophers-in-world-football/ – Date of access: 29.09.2022.
17. Top 10 Ultras of 2021 [Electronic resource]. – Mode of access: https://yoursportpress.com/-index.php/2022/01/04/top-10-ultras-of-2021/. – Date of access: 19.09.2022.
18. 10 most dangerous ultras of world football [Electronic resource]. – Mode of access: https://www.sportskeeda.com/football/10-most-dangerous-ultras-world-football. – Date of access: 19.09.2022.
19. Camus, A. What I owe to football / A.Camus. // The footballer's companion ; ed. by B. Glanville. – London : Eyre & Spottiswoode (Publishers) LTD. – P. 350–353.
20. Kłoskowska, A. Kultura masowa. Krytyka i obrona / A. Kłoskowska. – Warszawa : PWN, 2022. – 488 s.

*Рукапіс паступіў у рэдакцыю 29.09.2022*